*В.І. Еўмянькоў* (Магілёў)

# «DWAJ PANOWIE SIECIECHOWIE» / «ДВА ПАНЫ СЯЦЕХІ» ЮЛЬЯНА НЯМЦЭВІЧА Ў ГІСТОРЫІ ПОЛЬСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX ст.

Мастацкі стыль Ю.Нямцэвіча (1758 – 1841 гг.), лідэра польскамоўнай літаратуры першай чвэрці XIX ст., сфарміраваўся пад уплывам эстэтыкі класіцызму. І разам з тым Ю.Нямцэвіч – прадвеснік рамантызму. У яго творах надзвычай яскрава праявіліся канкрэтна-гістарычныя прыкметы часу (палітычны крызіс, галаманія, занядбанне сармацкіх / шляхецкіх традыцый), а вобразы, створаныя пісьменнікам, заўсёды мелі глыбока індывідуальныя рысы ("Powrót posła" / "Вяртанне пасла"), валодалі нацыянальнай адметнасцю ("Śpiewy historyczne" / "Гістарычныя песні"). Асаблівасці гістарызму Ю.Нямцэвіча выявіліся і ў "Двух панах Сяцехах" (1815 г.).

Падзеі твора звязаны з першай паловай 1810-х гг. Аўтар спыняецца ў доме Фларыяна Сяцехі, у якім пануе атмасфера старасвецкай гасціннасці, свойскасці. Гаспадар быццам сышоў з сармацкіх партрэтаў XVII ст.: контуш, пунсовы пас, вялізны саламяны капялюш, даўгія сівыя вусы. Пан Сяцеха нагадвае Суддзю з "Пана Тадэвуша". Абодва – добрыя гаспадары, "вока якіх і коней тучыць", абодва – не паны, а бацькі для сялян, якіх "лагодным словам", а не лаянкай і біццём заахвочваюць да працы.

Ідылія шляхецкага гнязда хутка разбураецца. У прастору дома Сяцехаў урываецца подых вайны. Злая сучаснасць прымушае шукаць адказ на пытанне, чаму гарманічная шляхецкая культура Рэчы Паспалітай, якую рэпрэзентуе Сяцеха, зруйнавана?

Адказ у дзённіках двух паноў Сяцехаў: прапрадзеда і сына пана Фларыяна. Першы – Вацлаў Сяцеха – пачаў занатоўваць свае запісы з 7 кастрычніка 1710 г. і завяршыў у 1717 г. Другі – Станіслаў Сяцеха – распачаў дзённік 7 кастрычніка 1808 г., а завяршыў у 1812 г. Тыповы лёс пана Вацлава. Адукацыю атрымаў у езуітаў, навучыўся ад іх пры ўсялякай нагодзе казаць палацінску, але ні сэнсу, ні змесу таго, пра што казаў, не разумеў (езуіты не патрабавалі асэнсавання завучваемага на памяць). Працягнуў адукацыю пры двары Гетмана, выканаў тым запавет бацькі, які сцвярджаў, што "шляхціцу,

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

хоць за клямку панскіх дзвярэй, але трымацца трэба". Атмасфера магнацкага двара эпохі войнаў за спадчыну Рэчы Паспалітай сведчыла аб дэградацыі вышэйшага саслоўя: п'янства, звады. Магнаты распачынаюць грамадзянскія войны, шляхціцы, падуладныя іх волі, не шкадуюць братняй крыві, зневажаюць законы.

Пан Вацлаў не саромеўся паведаміць, колькі выпіў за сталом або колькі вёсак атрымаў за выкананне злачынных загадаў свайго пана. Чалавек эпохі Барока, ён празмерны ва ўсім: у рэлігійнай экзальтацыі і ў пошуках задавальнення. Не думаў пан Вацлаў пра лёс Айчыны, калі па загаду Гетмана зрываў вальны сойм.

Праўдзівы тып контушовага д'ябла і шалёнага, бязглуздага выпівохі, пан Вацлаў увасабляе ўсе тыя заганы (крызіс сарматызму), якія спрычыніліся да заняпаду Рэчы Паспалітай.

Іншы пан Станіслаў Сяцеха. Адукацыю атрымаў у Рыцарскай школе (Варшава), якой кіравалі асветнікі. Са школы вынес цвярозы розум, патрыятызм, а таксама і веды, якія мог прымяніць на практыцы. У адрозненне ад пана Вацлава, ён жадаў служыць не магнату, а народу. Па гэтай прычыне займаўся ўдасканальваннем маёнтка, паляпшэннем умоў працы сялян. Падчас Напалеонаўскіх войнаў пан Станіслаў, як і многія яго аднагодкі, якія спадзяваліся на аднаўленне Рэчы Паспалітай, зрабіўся жаўнерам, ваяваў у складзе вайсковага корпуса Юзафа Панятоўскага, быў цяжка паранены (страціў нагу). Пан Станіслаў – патрыёт, які ставіць інтарэсы грамадскія вышэй за асабістыя. Яму супрацьстаяць касмапаліты і галаманы, якія з прыкрасцю ставяцца да ўсяго нацыянальнага, на бацькоўскі край глядзяць як на край варварскі, а ўласных дзяцей выхоўваюць як чужынцаў.

Такая маці Эдмундка N.N., стрыечнага брата пана Станіслава. Яна пераканана, што "выхаванае на Бацькаўшчыне дзіця ніколі не будзе мець ні розуму, ні ведаў. Нянавісць да ўсяго айчыннага завяла яе так далёка, што нават павітуху ды няньку з Францыі выпісала; асабліва ж назірала за тым, каб дзіця, хавай Божа, не сапсавала мову якім славянскім выразам". У выніку такога выхавання яе сын, Эдмундэк, жывіўся французскім паветрам, верыў у тое, што на роднай зямлі – толькі нуда ды галеча, бруд ды няшчасці. "Даводзіў я яму, – паведамляе пан Сяцеха, – што любіць трэба тую зямлю, на якой нарадзіўся, у якой ляжаць косці продкаў; а калі памылкі, нязгода бацькоў прывялі яе да заняпаду і спусташэння, то заняпад гэты яшчэ больш абавязкаў ускладае на плечы цяперашняга пакалення, якое павінна ўзняць край з небыцця" [1, s. 17].

Відавочна, што паміж сарматызмам перыяду заняпаду Рэчы Паспалітай і галаманіяй пачатку XIX ст. Ю. Нямцэвіч ставіць знак роўнасці, пераконвае чытача, што яны – праявы адной і той жа небяспечнай хваробы на зняверу.



Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

Заўважаецца таксама супрацьпастаўленне касмапалітычнай Варшавы і вёскі, якая ў Ю. Нямцэвіча – сімвал нацыянальнага, славянскага (пазней – гэта традыцыйная з'ява як у польскай, так і ў беларускай літаратуры мяжы XIX – XX стст.). Твор аб'ядноўвае два жанры – падарожныя нарысы (папулярныя цягам усёй першай паловы XIX ст.), а таксама жанр дыярыуша, характэрны для беларускай літаратуры XVII – XVIII стст.

## Літаратура

1. *Niemcewicz, J.U.* Dwaj panowie Sieciechowie / J.U. Niemcewicz. – Kraków: Universitas, 2003. – 37 s.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова